щения образов традиционной китайской драмы, стирания границ между аудиторией и музыкой, увеличения популярности как традиционной, так и постмодернистской музыки среди публики.

1. *Ли, Жуймин*. Исследование характеристик и ценностей современной китайской постмодернистской музыки на примере творчества Тан Дуня / Ли Жуймин // [D], Сычуаньский пед. ун-т. – 2016. – С. 14. – Изд. на кит. яз.: 李瑞敏.《当代中国后现代主义音乐的特征及价值研究—以谭盾作品为例》[D].四川师范大学,2016年，第14页.

2. *Синельникова, О. В.* Восток и Запад в мультимедийных проектах Тан Дуна / О. В. Синельникова // Вестн. Кемеровского гос. ун-та культуры и искусств. – 2020. – № 53. – С. 157–172.

3. *Narroway, Richard M.* Dissertation in Music Performance. A dissertation submitted in partial fulfillment of the requirements for the degree of Doctor of Musical Arts / Richard M. Narroway // DMA Diss., University of Michigan. – 2018. – 26 p.

УДК [78+72]:304Агінскія

***А. М. Емялёва,***
*старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі мастацтва*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПРАДСТАЎНІКОЎ РОДУ АГІНСКІХ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ

**Анатацыя**. Прадстаўлены звесткі як аб менш вядомых, так і знакамітых прадстаўніках роду Агінскіх, якія на працягу некалькіх стагоддзяў адыгрывалі значную ролю ў культурным жыцці Віцебшчыны. Аўтарам зроблена спроба стварыць радавод славутага роду, прадстаўнікі якога былі носьбітамі і транслятарамі лепшых узораў еўрапейскай культуры. Таксама разглядаецца мецэнацкая і фундатарская дзейнасць Агінскіх у галіне музычнага мастацтва, культавага будаўніцтва, драўлянага дойлідства і культавага мастацтва.

**Ключавыя словы**: культурна-асветніцкая дзейнасць, радаводнае дрэва, фундатарская дзейнасць, вакальна-інструментальная капэла, музычнае мастацтва, культавае будаўніцтва, музычная бурса, кляштар, калегіум, аматарская дзейнасць, інструментальныя мініяцюры, культурная рэзідэнцыя, нацыянальны каларыт, трансляцыя культурнай трады-

цыі, носьбіты культуры, культурнае развіццё рэгіёна, прыватная капэла, культурнае асяроддзе.

***A. Yemialeva,***
*Senior Lecturer of the Department of Theory and History of Art of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*

## CULTURAL AND EDUCATIONAL ACTIVITIES OF REPRESENTATIVES OF THE OGINSKY FAMILY IN VITEBSK REGION

**Abstract**. This article presents information about both lesser-known and famous members of the Oginski family, who for several centuries played a significant role in the cultural life of Vitebsk region. The authors made an attempt to create a genealogy branch of the famous family, whose representatives were carriers and translators of the best examples of European culture. The author also examines the patronage and sponsorship activities of the Oginski in the field of musical art, religious construction, wooden construction and religious art.
**Keywords**: cultural and educational activities, family tree, sponsorship, vocal and instrumental choir, music, cult construction, music scholarship, monastery, college, amateur activities, instrumental miniatures, cultural residence, national flavor, translation of cultural traditions, cultural media region, private chapel, cultural center.

На тэрыторыі беларускіх зямель у XVII–XVIII стст. існавалі шматлікія культурныя цэнтры – Радзівілаў, Сапегаў, Тызенгаўзаў, Агінскіх. Але ў той час былі і іншыя, менш вядомыя культурна-асветныя цэнтры. Сярод іх вызначаецца старажытны Віцебск, з культурным, грамадскім, палітычным, гаспадарчым жыццём якога была цесна звязана дзейнасць многіх прадстаўнікоў роду Агінскіх. Віцебшчына знаходзіцца на трэцім месцы пасля Смаленшчыны і Акінтаў па колькасці пражываючых прадстаўнікоў роду Агінскіх. Род князёў Агінскіх унесены ў V частку радаводнай кнігі Віленскай губерні і ў VI частку радаводнай кнігі Віцебскай губерні. Прозвішча роду Агінскіх паходзіла ад назвы маёнтка Агінты (Акінтаў, Вагінта), які знаходзіўся ў 40 кіламетрах на захад ад Трок і ў канцы XV ст. быў падараваны Аляксандрам Ягелонам беларускаму князю Дзмітрыю Іванавічу Глушонку [4, с. 21]. У Віцебску князі Агінскія, якія паходзілі ад расійскіх князёў з Казельска, пасяліліся на пачатку XVII ст. Леў Самуіл меў пяць дамоў у Рускім пасадзе і пляц зямлі каля царквы Св. Пятніцы, на якім

стаяў палац Агінскага – архітэктурны помнік Віцебска XVII–XVIII стст. [8]. Славуты род Агінскіх, многія прадстаўнікі якога жылі і дзейнічалі на Віцебшчыне, адыгрываў на працягу многіх стагоддзяў значную ролю ў культурным, палітычным, эканамічным і грамадскім жыцці нашых продкаў. Княжацкі род паступова ствараў моцнае радаводнае дрэва, займаючыся рознабаковай дзейнасцю.

У артыкуле закранаюцца тыя прадстаўнікі роду, якія мелі дачыненне да Віцебшчыны сваёй культурна-асветніцкай дзейнасцю і зроблена спроба апісаць радаводнае дрэва Агінскіх і месца ў радаводзе Міхала Клеафаса і Міхала Казіміра Агінскіх.

Багдан Мацвеевіч Агінскі (?–1625 г.) паходзіў з роду Дзмітрыя Іванавіча Глушонка (?–1510 г.), які атрымаў ад караля Аляксандра двор Вагінта Жыжморскага павету, – грамадскі, ваенны і дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, падкаморы трокскі, харунжы і кашталян трокскі, займаўся будаўніцтвам манастыроў, у 1610 г. у Віленскім праваслаўным брацтве арганізаваў работу друкарні, якая на працягу 1610–1640 гг. надрукавала больш за 25 найменняў выданняў [8, с. 3]. Б. М. Агінскі быў жанаты на Раіне Валовіч, меў чатыры сыны і чатыры дачкі. Сыны – Аляксандр (?–1667 г.) – харунжы і кашталян трокскі, Ян (?–1640 г.) – цівун трокскі, Леў Самуіл (?– 1657 г.) – стольнік трокскі, Дзмітрый (?–1610 г.) – стараста вінніцкі. Дочак звалі Ганна, Барбара, Дарота і Апалонія.

У Аляксандра было тры сыны – Ян (?–?), Багдан (?–1640 г.) – харунжы літоўскі, і Марцыян (1632–1690 гг.) – стольнік трокскі, валодаў графствам на Дуброўне, быў канцлерам ВКЛ, меў дзве дачкі – Аляксандру і Тэадору.

Леў Самуіл (1595–1657 г.) – дваранін, стольнік, цівун трокскі, меў маёнткі ў Трокскім і Віцебскім ваяводствах, заснаваў полацкі Богаяўленскі манастыр, фінансаваў будаўніцтва Маркавага манастыра ў Віцебску [2, с. 117–118]. Меў дваіх сыноў – Сымона Караля (1625–1694 гг.) – ваявода мсціслаўскі, падкаморы віцебскі, мечнік літоўскі, таксама фундатар кляштара кармелітаў у Вільні, пабудаваў храм Св. Троіцы ў Маркавым манастыры [2, с. 117]. Другі сын – Ян (Яцак) Самуіл (1625–1684 гг.) – ваявода полацкі, гетман літоўскі. Леў Самуіл меў і трох дачок – Крышціну (?–?), Рэгіну (1632–1695 гг.), Алену (?–1689 г.) [8].

У Сымона Караля Агінскага было чатыры сыны і тры дачкі – Багуслаў, Ежы, Аляксандр і Марцыян Міхал (1672–1750 гг.), які быў сынам ад шлюбу Сымона Караля і Тэадоры з роду Корсакаў. Марцыян Міхал – віцебскі ваявода, пражываў у Залессі. З яго дачок вядомы Сафія, Элеанора і Крысціна. Сымон Караль быў музычна адораны, з XVIII ст. захавалася яго скрыпічная саната [5, с. 377].

Брат Сымона Караля – Ян (Яцак) Самуіл меў шэсць сыноў – Мікалай Францішак, Рыгор Антоні, Леў Казімір, Аляксандр, Казімір Дамінік, Марцыян Антоні. У Рыгора Антонія была дачка – Эльжбета Магдалена Пузына (?–1767 г.), якая заснавала пры касцёле ў Лучаі, што каля Віцебска, дом для езуітаў і была фундатарам касцёла Св. Тадэвуша. Яна займалася навукай і заснавала астранамічную абсерваторыю пры Віленскай езуіцкай акадэміі, што і знайшло адлюстраванне ў паэме Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш».

Казімір Дамінік меў сына, якога звалі Юзэф Ян Тадэвуш, і дачок – Марцыбэлю, Тэрэзу, Марыяну, Алену (была дыпламатам, муж Ігнацы Агінскі). Вядома, што адна з дачок была замужам за Станіславам Ежы Агінскім.

Сын Сымона Караля – Марцыян Міхал (1672–1750 гг.) быў віцебскім ваяводам, кашталянам і мечнікам ВКЛ, заснавальнікам Віцебскай вакальна-інструментальнай капэлы [9, с. 37]. Ён меў уладанні ў Мікуліна, Лёзна, Марцыянава, Веляшковіцкае і Бабінавіцкае староствы [4, с. 23]. Марцыян Міхал выступаў фундатарам бернардзінскага касцёла Св. Антонія ў Мікуліна, [8], віцебскага дамініканскага кляштара, езуіцкага калегіума [1, с. 190]. У яго было пяць сыноў і шэсць дачок. Ігнацы (?–1775 г.) – дзяржаўны дзеяч, дыпламат ВКЛ, маршалак літоўскі, віцебскі кашталян і рэгент ВКЛ. Ён разам з жонкаю Аленай быў пахаваны ў фамільным склепе ў Віцебскім езуіцкім калегіуме; Тадэвуш Францішак (1712–1783 гг.) – уладальнік Залесся, кашталян трокскі, вялікі літоўскі пісар, меў уладанні на Віцебшчыне [8], фундатаваў Троіцкую царкву на Пескавацiку, зрабіў фундацыйны запіс на Тадулінскі базыльянскі кляштар, меў сваю вакальна-інструментальную капэлу і аркестр, якія ігралі разам з аркестрам музычнай бурсы пры Віцебскім езуіцкім калегіуме [5, с. 377]; Казімір Ігнацы (?–1769 г.), Станіслаў Ежы (1710–1748 гг.) – з 1740 г. віцебскі

кашталян, таксама меў сваю вакальна-інструментальную капэлу і аркестр [9, с. 20]. З дачок Марцыяна Міхала вядома інфармацыя аб Варвары, Ганне, Марцэліне, Бенедыкце, Станіславе і Марыі. Марцыян Міхал быў таксама вядомы як фундатар касцёла Св. Антонія ў маёнтку Мікуліна і дамініканскага кляштара ў Віцебску.

У Тадэвуша Францішака нарадзіліся два сыны: Анджэй Ігнацы (1740–1787 гг.) – дыпламат, больш актыўна праявіў сябе ў Польшчы, і Францішак Ксаверый [7].

У Анджэя Ігнацы было двое дзяцей: дачка Юзэфа і сын Міхал Клеафас Агінскі (1765–1833 гг.) – знакаміты кампазітар і грамадскі дзеяч, які стаў вядомы, дзякуючы напісаным ім характэрным і арыгінальным паланэзам і меладычным рамансам [4, с. 23; 7]. Міхал Клеафас пакінуў пасля сябе мемуары ў 4-х тамах на французкай мове, ён вядомы як музыкант, дзяржаўны дзеяч, патрыёт, воін, гісторык. Міхал Клеафас вучыўся ў Іосіфа Казлоўскага, з'яўляўся аўтарам «Писем о музыке». У Фларэнцыі ён пісаў вершы на польскай, французкай і італьянскай мовах. У яго творчай спадчыне каля 60 кароткіх мініяцюр, сярод якіх больш за 20 паланэзаў, аднаактная опера. Міхал Клеафас меў многа дзяцей, яго дочкі – Амелія, Ірэніуш, Эма, Іда. Першы сын, Тадэвуш Антоні (1798–1844 гг.), з'яўляўся аўтарам «Марша ў чатыры рукі». Другі сын, Францішак Ксаверый (1801–1837 гг.), пакінуў шэраг вакальных і інструментальных мініяцюр, сярод іх раманс «Паранены ў Павіі паж», французкі тэкст якога належаў Леанарду Ходзьку, асабістаму сакратару Міхала Клеафаса, рамансы «Ложак», «Вяртанне з Круазэ», «Трыялет», таксама ён стварыў шэраг фартэпіянных паланэзаў, тры з іх прысвечаны бацьку [6, с. 131]. У апошнім паланэзе былі выкарыстаны мелодыі з рамансаў Міхала Клеафаса. Францішак Ксаверый вядомы як аўтар паланэза з оперы С. Спанціні «Вясталка». Музычна адоранай была і дачка Амелія (1803–1858 гг.), бо часта выконвала на фартэпіяна творы бацькі і рабіла іх апрацоўкі, напісала некалькі рамансаў і паланэз у чатыры рукі до мінор [6, с.132].

Музыкай цікавіліся і ўнукі М. К. Агінскага – Багдан Міхал і Міхал Мікалай. Першы ўтрымліваў аркестр і адкрыў бясплатную музычную школу ў Плунгу. У аркестры Міхала Мікалая іграў і юнак Мікалоюс Канстанцінас Чурлёніс, які прысвяціў князю Агінскаму «Паланэз для духавога аркестра» [6, с. 132].

Другая галіна роду, паходзячая ад брата Сымона Караля Агінскага – Яна Яцака – праз яго ўнука, Яна Тадэвуша, выводзіць нас на другога славутага прадстаўніка роду Агінскіх – Міхала Казіміра Агінскага (1729–1800 гг.) – вялікага гетмана літоўскага, дзяржаўнага дзеяча, які пабудаваў Агінскі канал у Слоніме, знакаміты тэатр «Опернхаўз» з арыгінальнай сцэнай. Ён будаваў фабрыкі, добра маляваў і іграў на некалькіх інструментах, ведаў тэорыю музыкі і таксама меў кампазітарскі талент, напісаў некалькі песень, якія адрозніваліся нацыянальным каларытам [9, с. 22]. Міхал Казімір Агінскі меў галоўную рэзідэнцыю ў Слоніме, якую ён пераўтварыў у «сядзібу муз» сваёй рэфарматарскай дзейнасцю. Міхал Казімір добра валодаў ігрой на многіх музычных інструментах, прыдумаў педаль для арфы і ў 1760 г. іграў на ёй для Дэні Дзідро, пасля чаго быў высока ацэнены як музыкант. За добрае валоданне некалькімі музычнымі інструментамі быў празваны «гетман–кларнет». Міхал Казімір пісаў вершы і музыку, займаўся жывапісам, увайшоў у гісторыю літаратуры як паэт, драматург і перакладчык. На Брэстчыне ў Целяханах ён заснаваў фаянсавую мануфактуру, якая выпускала вазы і посуд, карнізы і фрызы для печак і камінаў, скульптуру малых форм. Ён пакінуў пасля сябе 60 опер, 18 балетаў, некалькі санат, 253 сімфоніі і іншыя творы.

Ян Тадэвуш, акрамя сына Міхала Казіміра, меў пяць дачок, якіх звалі Аўгуста, Генавеора, Катаржына, Казіміра і Эльжбета.

Зараз вядомыя нашчадкі роду Агінскіх, нашы сучаснікі, таленавітыя піяністы, Анджэй і Іво Залускія, якія нарадзіліся ў Польшчы, потым пераехалі ў Англію. Яны цесна звязаны з музыкай, маюць педагагічную адукацыю. Іво, акрамя фартэпіяна, валодае ігрой на ўсіх клавішных інструментах, кларнэце, гітары. У яго творчасці праявіўся і кампазітарскі талент (як спадчына продкаў): ён аўтар мюзіклаў, рок-опер, рок-сімфоній, урачыстых мес, у якіх аб’яднана гучанне аргана, аркестра, рок-групы, хору і салістаў [10, с. 9–10].

Такім чынам, мы мелі магчымасць даведацца пра асобных прадстаўнікоў роду Агінскіх, аб выніках іх дзейнасці ў дачыненні да Віцебшчыны, пра якія дагэтуль было вядома няшмат. Род князёў Агінскіх, якія ў XVII–XVIII стст. жылі на Віцебшчыне, аказваў прыкметны ўплыў на культурнае развіццё рэгіёна. Агінскія, прадстаўнікі арыстакратычнай эліты, выхава-

най на лепшых узорах еўрапейскай культуры, самі былі носьбітамі гэтай культуры, глыбока асэнсаванай і засвоенай праз уласны вопыт. Іх рэзідэнцыі на Віцебшчыне з'яўляліся тымі асяродкамі, праз якія адбывалася трансляцыя еўрапейскай культурнай традыцыі на мясцовую глебу [3]. Перш за ўсё гэта тычылася музычнага мастацтва, палацава-паркавага і культавага будаўніцтва, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фундатарскай дзейнасці. Культурна-асветніцкая дзейнасць Агінскіх аказвала ўплыў і на развіццё мясцовай рамесніцкай вытворчасці, яна выяўлялася і ў падтрымцы народнай культуры ў галіне драўлянага дойлідства і сакральнага мастацтва.


*1.* Беларусь паміж Усходам і Захадам: праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу : матэрыялы II Міжнароднага кангрэса беларусістаў, Мінск, май 1995 г. / рэдактары: У. Конан, А. Мальдзіс, Г. Цыхун. – Мінск : ННАЦ, 1997. – Ч. 1. – 356 с.

*2. Бубенька, Т. С.* Кафля з гербамі Агінскіх з Віцебска / Т. С. Бубенька, Л. У. Хмяльніцкая // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 1994. – № 3. – С. 115–121.

*3. Дадиомова, О. В.* Музыкальная культура городов Белоруссии в XVIII веке / О. В. Дадиомова. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 205, [1] с.

*4. Кляшчонак, Т.* З беларускага роду Глушонкаў / Т. Кляшчонак // Кантакты і дыялогі. – 1997. – № 9–10, верас.–кастр.

*5. Мальдзіс, А. В.* Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі : эсэ; Восень пасярод вясны : аповесць, сатканая з гістарычных матэрыялаў і мясцовых паданняў / А. В. Мальдзіс. – Мінск : Мастац. літ., 2009. – 479 с.

*6. Немагай, С. М.* З гісторыі музычнага аматарства на Беларусі / С. М. Немагай // Музычная культура Беларусі. Пошукі і знаходкі. – Мінск, 1998. – С. 128–135.

*7. Савіцкі, Ул.* Агінскія – імя славутае / Ул. Савіцкі // ЛіМ. – 1970. – 2 кастр.

*8. Хмяльніцкая, Л. У.* Князі Агінскія ў Віцебску [XVII–XVIII стст.] / Л. У. Хмяльніцкая // Выбар. – 1993. – 21 крас. – 4 траўн. (№ 12). – С. 3.

*9. Цеханавецкі, А.* Маці ўсіх навук / А. Цеханавецкі // Мастацтва. – 1993. – № 4, 6.

*10. Залуский, А.* Время и музыка Михаила Клеофаса Огинского / А. Залуский ; пер. с англ. В. Плютова ; вступ. ст. Л. Анцух, В. Счастного, А. Мальдиса. – 2-е изд., доп. – Минск : Четыре четверти, 2015. – 206 с. : ил.